как абсолютное большинство населения Шотландии проголосовало за нахождение в ЕС, а также усложнилось урегулирование торговых отношений с Европейским союзом. С учетом всех последствий брексита, неизвестно, какими были бы результаты референдума, если бы он прошел еще раз.

**Литература**

1. Brexit: Causes and Consequences [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.cidob.org/en/publications/publication_series/notes_internacionals/n1_159/brexit_causes_and_consequences. – Дата доступа: 07.04.2023.

2. What Was Brexit, and How Did It Impact the UK, the EU, and the US? [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://wwwthebalancemoneycom.translate.goog/brexitconsequences4062999?_x_tr_sl=en&_x_tr_tl=ru&_x_tr_hl=ru&_x_tr_pto=sc. – Дата доступа: 07.04.2023.

3. What impact has Brexit had on the UK economy? [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.bbc.com/news/business-64450882. – Дата доступа: 07.04.2023.

4. Consequences of Brexit [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.studysmarter.us/explanations/macroeconomics/macroeconomics-examples/consequences-of-brexit/. – Дата доступа: 07.04.2023.

## Шляхецкія маёнткі як месца захавання саслоўных традыцый у канцы XVIII–XIX ст.

*Пухцеева Л. С., магістрант БДУ,*
*навук. кір. Макарэвіч В. С., канд. гіст. навук, дац.*

Падзелы Рэчы Паспалітай былі для шляхты трагедыяй, з якой прадстаўнікі саслоўя спраўляліся па-свойму. Яны аб’ядноўваліся ў закрытыя групы, імкнуліся падкрэсліць сваю ўнікальнасць, вярталіся да сармацкіх элементаў як да традыцыйнай шляхецкай ідэалогіі, назапашвалі гістарычную памяць аб Рэчы Паспалітай і г.д. У той жа час у першай палове XIX ст. набілітэт не губляў надзей на адраджэнне сваёй дзяржаўнасці. Для дасягнення гэтага ў першую чаргу неабходна было ўсімі сіламі спрабаваць захаваць «старапольскія рэлікты», старыя парадкі. Дасягнуць гэтага можна было, па-першае, за кошт кансервацыі гэтай культуры, гераізацыі мінулага, постацей продкаў і іншага, па-другое, за кошт выхавання новых пакаленняў на гэтай аснове. Асаблівым асяроддзем, якое магло выканаць усе вышэйпералічаныя задачы, былі шляхецкія сядзібы.

Сядзіба займала ключавое месца ў шляхецкай культуры. Перш за ўсё сядзіба з’яўлялася матэрыяльнай базай дваранскага побыту, складала аплот шляхецкіх родаў, іх сямейнае гняздо. Сядзіба павінна была падкрэсліваць высокі статус гаспадара, адлюстроўваць дабрабыт і багацце, праслаўляць яго род. Акрамя рэпрэзентатыўнай функцыі, маёнтак таксама выконваў ролю натуральнага

асяроддзя, у якім акумуляваліся сямейныя традыцыі і шляхецкая культура, што аказвала ўплыў на фарміраванне саслоўна-родавай ідэнтычнасці. У інтэр'ер маёнтка былі ўключаны пэўныя знакі шляхетнасці: гербавыя картушы ўладальнікаў маёнтку на франтонах порцікаў і брам, партрэтныя галерэі продкаў, нацыянальных герояў і іншых значных фігур, памятныя дошкі з нагоды гістарычных падзей, якія звязваліся з дадзенай мясцінай і родам, і іншыя важныя элементы [1, с. 53].

Прадстаўнікі саслоўя адчувалі сентыментальнасць і прыхільнасць да свайго маёнтка: гэта быў своеасаблівы храм шляхты, дзе маглі жыць розныя пакаленні роду (адначасова ці не), месца, дзе шляхціц нарадзіўся і вырас. Сядзіба – і сімвал роду, сямейнай традыцыі, і месца, у якім была заключана «рэчпаспалітаўская» культура, аазіс былой дзяржаўнасці.

Пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі адбывалася «музеефікацыя» жыцця маёнткаў [1, с. 54]. Лакалізцыя грамадскага, свецкага і культурнага жыцця ў маёнтках стала рэакцыяй на навязванне агульнаімперскай свядомасці дваранскаму саслоўю беларуска-літоўскіх губерняў [2, с. 65]. У вачах мясцовага набілітэту сядзіба зрабілася ўвасабленнем страчанай радзімы. Атмасфера шляхецкіх маёнткаў была закансервавана на ўзор мінулага стагоддзя [3, с. 133].

Дадзеную праблематыку ў паэме «Mowa polska» выклаў Францішак Мараўскі:

«У гэтых дварах жыве Польшча:
У іх апошня абарона,
У іх хаваецца скарб запаветны –
Годнасці нашай карона» [4, с. 524].

У сценах маёнткаў захоўвалася памяць пра Рэч Паспалітую, адбываўся зварот да традыцыйнай шляхецкай культуры, што выходзіла за рамкі выключна культуры і набывала палітычнае адценне [2, с. 65]. Кола ўдзельнікаў такіх асяродкаў было досыць замкненым, новыя суграмадзяне (рускія чыноўнікі) у іх склад практычна не дапускаліся [5, с. 35, 125].

А. Міцкевіч таксама не абышоў бокам гэтую тэму: «...гэтая ўнутраная традыцыя складаецца з рэшткаў меркаванняў і пачуццяў, якімі жылі нашы продкі; гэтая традыцыя – пасля заняпаду, падзелаў і падаўлення грамадскай думкі – схавалася ў дамах шляхты і простага люду. (...) З гэтых традыцый павінна выйсці і незалежнасць краіны, і будучая форма яе праўлення» [6, с. 191–192]. Шляхецкія маёнткі Міцкевіч параўноўвае з сэрцам, вакол якога засяроджваецца жыццёвая сіла ў аслабленым арганізме. На яго думку, менавіта там яе трэба шукаць і на ўсё цела зноў размяркоўваць [6, с. 192].

У якасці найбольш маляўнічага прыкладу такога «гнязда» можна прывесці Сапліцоўскі двор з паэмы «Пан Тадэвуш» (вобраз якога А. Міцкевіч, відаць,

стварыў якраз на аснове сваіх поглядаў, прыведзеных вышэй). Па-першае, сядзіба перапоўненая вялікай колькасцю памятных рэчаў аб незалежнай Рэчы Паспалітай. Так, тут прысутнічаюць партрэты Касцюшкі у чамары, Рэйтана, апранутага «па-польску», Ясінскага, Корсака [7, с. 7]. Важным элементам інтэр'еру з'яўляецца таксама стары курантавы гадзіннік, які грае "Мазурку Дамброўскага" [7, с. 7–8]. Згадваецца таксама старадаўні сервіз, якім карысталіся па святах [7, с. 337]. Усё гэта было для таго, каб моладзь не забылася аб тым, што Рэч Паспалітая – вольная краіна, калі не на мапе Еўропы, то хаця б у гэтым адным двары.

Такім чынам, шляхецкія сядзібы адыгрывалі ролю асяроддзя, ў якім захоўваліся старыя парадкі і традыцыі, а таксама назапашвалася гістарычная памяць аб Рэчы Паспалітай дзеля «кансервацыі» страчанай айчыны і выхавання наступных пакаленняў у рэчпаспалітаўскіх традыцыях.

**Літаратура**

1. Шыдлоўскі, С. А. Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795–1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі. – Мінск : Бел. навука, 2011. – 168 с.

2. Анофранка, Н. Дваранкі беларуска-літоўскіх губерняў у палітычным жыцці (канец XVIII – першая палова XIX ст.) / Наталля Анофранка // Гістарычна-археалагічны зборнік / Інстытут гісторыі, Нацыянальная акадэмія навук Беларусі. – Мінск. – 2012. – Вып. 27. – С. 65–69.

3. Цвікевіч, А. І. «Западно-руссизм»: нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / Аляксандр Цвікевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 350 с.

4. Zbiór poetów polskich XIX w. ; ułożył i opracował Paweł Hertz. Ks. 1. – 1959. – 1129 s.

5. Патоцкі, Л. Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружану / Л. Патоцкі ; пер. з пол. І. У. Саламевіча. – Мінск : Полымя, 1997. – 270 с.

6. Mickiewicz, A. Dzieła: wydanie rocznicowe, 1798–1998 / Adam Mickiewicz. T. 6: Pisma filomackie; Pisma polityczne z lat 1832–1834 [tom opracowali: M. Witkowski, Cz. Zgorzelski]. – 2000. – 497 s.

7. Міцкевіч, А. Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве: шляхецкая гісторыя з 1811 і 1812 гг. у дванаццаці кнігах вершам: [эпічная паэма] / Адам Міцкевіч. – Мінск : Папуры, 2019. – 383 с.